ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.11.2023 № 519

# Білеты
# для правядзення экзамену ў парадку экстэрнату
# пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы
# сярэдняй адукацыі
# па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура»

2023/2024 навучальны год

Білет № 1

1. Жыццё і дзейнасць беларускай асветніцы Ефрасінні Полацкай (паводле «Жыція Ефрасінні Полацкай»).

2. Сучасная беларуская драматургія (на прыкладзе творчасці аднаго-двух аўтараў).

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Багдановіча «Раманс» («Зорка Венера»).

Білет № 2

1. Францыск Скарына – першадрукар і асветнік.

2. Тэмы і вобразы паэзіі Максіма Танка. («Мой хлеб надзённы», “Завушніцы”,”Ты яшчэ толькі намёк на чалавека…” і інш.).

3. Прачытаць на памяць верш сучаснага беларускага паэта (на выбар).

Білет № 3

1. Патрыятычныя матывы ў лірыцы Алеся Гаруна («Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады»).

2. Тэма гістарычнага мінулага Беларусі ў аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха».

3. Прачытаць на памяць верш Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць».

Білет № 4

1. Паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» як выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння.

2. Ідэйны змест апавядання Міхася Стральцова «Сена на асфальце».

3. Прачытаць на памяць урывак з твора Уладзіміра Караткевіча «Паром на бурнай рацэ».

Білет № 5

1. Рамантычныя сюжэты і вобразнасць у творчасці Яна Баршчэўскага (на прыкладзе двух апавяданняў са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»).

2. Тэмы і вобразы ў лірыцы Аркадзя Куляшова («Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому…» і інш.).

3. Прачытаць на памяць верш Яўгеніі Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві…».

Білет № 6

1. Вобраз галоўнага героя ў паэме Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе».

2. Праблема маральнага выбару ў аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык».

3. Прачытаць на памяць урывак з рамана ў вершах Ніла Гілевіча «Родныя дзеці».

Білет № 7

1. Сатырычны і гуманістычны пафас камедыі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта».

2. Кандрат Крапіва – байкапісец. Тэматычная разнастайнасць і ідэйная накіраванасць баек.

3. Прачытаць на памяць верш Янкі Купалы «Явар і каліна».

Білет № 8

1. Асноўныя матывы лірыкі Уладзіміра Дубоўкі («Залатая асенняя раніца», «О Беларусь, мая шыпшына…», «Родная мова, цудоўная мова!»).

2. Аповесць Васіля Быкава «Знак бяды»: яе ідэйны змест, вобразы галоўных герояў.

3. Прачытаць на памяць верш Янкі Купалы «Спадчына».

Білет № 9

1. Тэматыка і асноўныя вобразы паэзіі Францішка Багушэвіча («Мая дудка», «Хмаркі», паэма «Кепска будзе!»).

2. Сучасная беларуская проза (на прыкладзе творчасці аднаго-двух аўтараў).

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Багдановіча «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»).

Білет № 10

1. Апавяданне Максіма Гарэцкага «Літоўскі хутарок». Трагізм лёсу герояў.

2. Тэмы і вобразы ў лірыцы Максіма Танка («Родная мова», «Мой хлеб надзённы» і інш.).

3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля».

Білет № 11

1. Звесткі пра жыццё і творчасць Янкі Купалы.

2. Тэматыка і праблематыка рамана Івана Мележа «Людзі на балоце».

3. Прачытаць на памяць верш Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей».

Білет № 12

1. Тэматычная разнастайнасць і стылёвая шматграннасць лірыкі Янкі Купалы.

2. Апавяданне Івана Чыгрынава «Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Лёс старога лесніка Дземідзёнка.

3. Прачытаць на памяць верш Уладзіміра Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына …».

Білет № 13

1. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім».

2. Сучасная беларуская паэзія (на прыкладзе творчасці аднаго-двух аўтараў).

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Багдановіча «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…».

Білет № 14

1. Драматургічнае майстэрства Янкі Купалы (п’еса «Раскіданае гняздо» або «Паўлінка»).

2. Тэмы і вобразы ў лірыцы Петруся Броўкі («Пахне чабор», «Спатканне»).

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека…».

Білет № 15

1. Звесткі пра жыццё і творчасць Якуба Коласа.

2. Тэматычная разнастайнасць лірыкі Пімена Панчанкі («Герой», «Той дзень прапаў і страчаны навекі…», «Спарышы», «Крык сойкі»).

3. Прачытаць на памяць урывак з апавядання Міхася Стральцова «Сена на асфальце».

Білет № 16

1. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» – мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця.

2. Сацыяльна-філасофскі змест рамана Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні». Тэма «скрадзенага дзяцінства».

3. Прачытаць на памяць байку Кандрата Крапівы «Дыпламаваны Баран».

Білет № 17

1. Тэматычная разнастайнасць лірыкі Якуба Коласа.
2. Праблематыка рамана Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі».
3. Прачытаць на памяць верш Ніла Гілевіча «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..».

Білет № 18

1. Гісторыя напісання і праблематыка трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» (кніга першая – «У палескай глушы»).
2. Нацыянальнае і агульначалавечае ў лірыцы Рыгора Барадуліна («Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Чалавек не ўзнікае так…», «Заспаная раніца мжыстая…», «Бацьку»).
3. Прачытаць на памяць верш Пімена Панчанкі «Герой».

Білет № 19

1. Звесткі пра жыццё і творчасць Максіма Багдановіча.
2. Спалучэнне трагічнага і камічнага ў п’есе Андрэя Макаёнка «Зацюканы апостал».
3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы Янкі Купалы «Курган».

Білет № 20

1. Вобраз Радзімы ў лірыцы Максіма Багдановіча («Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Слуцкія ткачыхі» і інш.).
2. Праблематыка рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні».
3. Прачытаць на памяць урывак з рамана Івана Мележа «Людзі на балоце».